

# Валэйка Гелена Антонаўна

Галоўны бухгалтар КСУП «Гервяты» Гелена Валэйка.

– Хто паведаміў, што ваш партрэт трапіў на Дошку гонару і што пры гэтым адчулі?

Гелена Антонаўна:

– Пра гэта расказала тагачасны намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Алена Сцефановіч. На раённую Дошку гонару мой партрэт трапіў у другі раз – упершыню ў 2015 годзе. Любому работніку важна ацэнка яго дзейнасці. Лічу, што ў КСУП «Гервяты» шмат адказных, добрасумленных працаўнікоў – бадай што кожны з іх варты лічыцца гонарам раёна. Па вялікім рахунку, паспяховасць работы любога сельгаспрадпрыемства залежыць ад таго, наколькі адказна кожны будзе выконваць свае абавязкі на сваім участку, і гэта тычыцца не толькі спецыялістаў.

– Чаму на Дошку гонару заносяць партрэт даяркі ці механізатара, зразумела. А за якія заслугі ў ганаровую галерэю, думаеце, трапіла ваша прозвішча? І якія крытэрыі вызначаюць паспяховасць дзейнасці галоўнага бухгалтара?

Гелена Антонаўна:

– Штат нашай гаспадаркі складае звыш 370 чалавек. У бухгалтэрыі акумулюецца работа ўсяго калектыву: вядзём улік прываг, надояў, налічваем заработную плату, сочым за эканоміяй… Апошні складнік лічу самым галоўным у развіцці сельгаспрадпрыемства.

Не мне меркаваць, чаму маё прозвішча па выніках 2021 года трапіла ў лік ганаровых. Пра гэта трэба цікавіцца ў кіраўніцтва КСУП «Гервяты». Але ўдзячна за давер.

– Узгадайце першы працоўны дзень і раскажыце, як «выраслі» да пасады галоўнага бухгалтара?

Гелена Антонаўна:

– Прафесію выбрала выпадкова. Дакладна не ведала, кім хачу быць. Пасля заканчэння Ашмянскага сельскагаспадарчага тэхнікума мяне накіравалі на Астравеччыну ў калгас «Радзіма» – было гэта напачатку 80-х гадоў. Удзячна тагачаснаму старшыні Андрэю Андрэевічу Галагаеву, які мяне, дзевятнаццацігадовую, літаральна з парога канторы супакоіў: «Не хвалюйся, усё атрымаецца!» І спецыялісты добра і прыязна сустрэлі. На дварэ – жнівень, самы гарачы час для аграрыяў. Мяне накіравалі на гервяцкі склад весці ўлік збожжа. Акрамя гэта, «курыравала» вытворчасць сельгаспрадукцыі жывёлагадоўлі. Калі браць бухгалтарскі ўлік, то знутры ведаю работу ўсіх участкаў і накірункаў.

У 1986 годзе мяне прызначылі намеснікам галоўнага бухгалтара, а з 2000-га – галоўным. Завочна адвучылася ў Ленінградскім сельскагаспадарчым інстытуце.

– Ці здараліся ў вашай рабоце памылкі і як вы да гэтага ставіцеся?

Гелена Антонаўна:

– Памылкі, напэўна, здараюцца ў кожнага. Што тычыцца бухгалтарскай справы, то гэта ў асноўным падліковыя хібы ці несвоечасова здадзеная справаздача. І я памылялася, і іншыя бухгалтары. Стараемся разам вырашыць усе пытанні. У такім выпадку не трэба кідацца ў роспач ці, як кажуць, рваць на сабе валасы, – але абавязкова варта прааналізаваць сітуацыю, зразумець, чаму здарылася тая ці іншая памылка, каб больш не паўтарыць.

– Які перыяд на працягу года вам падабаецца найбольш і найменш і чаму?

Гелена Антонаўна:

– Люблю вясну. Па-першае, менш бухгалтарскай работы; па-другое, і вока, і душу радуе прырода: з выраю птушкі прыносяць доўгачаканае цяпло, на клумбах і ўзлесках зацвітаюць першыя кветкі.

Як для галоўнага бухгалтара, самыя складаныя – студзень і люты. Гэта і падвядзенне вынікаў работы за год, і балансы-справаздачы – часам даводзіцца заставацца на рабоце пасля заканчэння працоўнага дня.

– Якую прафесійную ролю хацелі б прымерыць?

Гелена Антонаўна:

– Не задумвалася, кім магла б стаць, акрамя як бухгалтарам… (Задумваецца.) Напэўна, была б добрым рэвізорам – падабаецца шукаць памылкі і нядрэнна гэта атрымліваецца. (Усміхаецца.)

– Што папрасілі б у залатой рыбкі?

Гелена Антонаўна:

– Заставацца здаровай. Лічу, што маё жыццё склалася найлепшым чынам. Ніколі не падумала б, што Гервяты стануць маёй другой радзімай – 42 гады тут. З мужам выгадавалі траіх дзяцей, маем сямёра ўнукаў. Большай радасці, як для матулі і бабулі, для мяне няма, калі яны ўсе на вялікія святы збіраюцца ў бацькоўскай хаце.

– Кажуць, кіраўнік (старшыня) на вёсцы – бацька, дзядзька і суддзя. Хто ў такім разе галоўны бухгалтар?

Гелена Антонаўна:

– Галоўнага бухгалтара, як і старшыню, ведаюць усе ў твар у гаспадарцы! Так што гэта другі чалавек на вёсцы пасля кіраўніка.

Слова калегам

Таццяна Вяржынская, бухгалтар КСУП «Гервяты»:

– З Геленай Антонаўнай разам працуем з 1985 года. Яна адказная, патрабавальная, строгая, але адначасова чулая да праблем калег і падначаленых. Вялікая заслуга нашага галоўнага бухгалтара ў камп'ютарызацыі работы – хутка асвоіла ўсе патрэбныя праграмы.

https://www.ostrovets.by
Текст: Алёна Ганулич
Фото: Алена Ганулич